***Таццяна Матусевіч***

# РОЛЯ САСТАРЭЛЫХ БАЦЬКОЎ У СЯМЕЙНЫМ УКЛАДЗЕ БЕЛАРУСАЎ

Раней у беларусаў даволі часта сустракаліся вялікія сем'і, у якіх пад адным дахам ужываліся тры і больш пакаленняў: дзед з бабаю, бацька з маці, два браты з жонкамі і кагалам дзяцей, незамужняя сястра ці бабыль-брат, ды яшчэ мог жыць у сям'і прыблудны зусім чужы дзед-жабрак. Жылі, мірыліся паміж сабой. А што было рабіць? Выйсця іншага не было. Аддзяляцца ад бацькоў (хоць і хацелася) часта па сацыяльных прычынах не выпадала, працаваць разам было весялей і спарней, а самае галоўнае – маральныя ўстоі народа былі такія, што старых трэба паважаць і берагчы, незамужнюю сястру з дому не выкінеш (ды і ніхто не збіраўся нікога выганяць). Казалі: «Лішні чалавек у сям'і – не згуба. Сям'я гушчу любіць» [1,3]. Калі нельга было па-іншаму жыць, то выпадала мірна суіснаваць і кожнаму падпарадкоўвацца волі гаспадара. Ва ўсіх было сваё месца, сваё прызначэнне, свае абавязкі і правы. Таму захавалася шмат сведчанняў у вуснай народнай творчасці, літаратуры і людской памяці.

Якія ж ролі былі ў састарэлых бацькоў (дзядоў, прадзедаў)? Чаму гаварылі ў народзе: «Стары, кажуць, змуста (той, каго мусяць, абавязаны даглядаць), ды без яго ў дварэ пуста. Старога чалавека пабранка – двару папраўка» [1,2]?

А роляў у сямейным укладзе ў старых было дастаткова. І першая з іх – дапамога сям'і ў працы. Няхай нават фізічна работнікі з іх не вельмі важныя, але даць параду, паказаць эфектыўны спосаб прыгледзець за гаспадаркай, па дробезях і не толькі, маглі многія старыя. Успомніце «Палескую хроніку» І. Мележа. Там стары Дзяніс, дзед аднаго з галоўных герояў - Васіля Дзятла, пару-тройку разоў узгадваецца. З кароткіх эпізодаў пра дзеда Дзяніса чытач даведваецца, як моцна стары ўплываў на сямейны уклад, пра павагу да яго з боку ўсіх сямейнікаў і яго прагу да працы (і на падглядзе пчол лепш за маладых зробіць, і рыбы наловіць, і касу адаб'е, і ўнука дагледзіць і інш.).

Вельмі важная роля старых у традыцыйнай беларускай сям'і – перадача вопыту ў сацыяльным укладзе і трансляцыя сямейных і абрадавых традыцый. Старыя за жыццё шматразова вывяралі каляндар, спрабавалі розныя зёлкі ад розных хвароб, як кажуць, на сваёй скуры і маглі дакладна падказаць маладым, як дзейнічаць у розных сітуацыях. Іх парады былі неабходнымі і ў працы на полі і агародзе. Менавіта са шматгадовых назіранняў былі зроблены многія высновы, якімі і зараз карыстаюцца людзі (да прыкладу: на Пахома час саджаць агуркі; а пшаніцу сеялі тады, калі на зямлі можна было пасядзець). Пажылыя людзі шмат разоў за жыццё бывалі на вяселлях, хаўтурах, радзінах, улазінах і праводзінах. У іх – вопыт сваіх і чужых поспехаў і памылак. Толькі б было каму з гэтага вопыту рабіць высновы. І толькі той раней не слухаў парад старога чалавека, пра каго казалі ў народзе: «Дурань законаў не мае, але свае выдумляе» [1,4].

У нашым рэгіёне, як і паўсюдна на Беларусі, існавала правіла: пакуль стары бацька заставаўся ў сіле, працаваў на полі і па гаспадарцы, да таго часу ён быў галоўным у сям'і. Яго ўсе слухаліся і яму падпарадкоўваліся. Калі ж стары станавіўся зусім нямоглым – главенства пераходзіла да сына, але старых бацькоў падкрэслена паважалі і заўсёды карысталіся іх парадамі. Састарэлыя бацькі былі найвышэйшым аўтарытэтам для свайго роду. Нават святароў не так слухаліся, як іх. Пасля царкоўных службаў людзі абмяркоўвалі тое, што ім было сказана святаром і часта не згаджаліся, гаворачы: «А мой дзед казаў не так...», «А мая баба калісь казала...». На нашых землях зберагалося вялікае мноства дахрысціянскіх звычаяў, бо святар не мог забараніць людзям рабіць тое, што дазвалялася продкамі. Сустракаліся і няз'едлівыя насмешкі з фізічнай нямогласці людзей ва ўзросце: «За старою галавою, як за пнём» [1,4]. А большасць заўважала: «Стары гаворыць – гародзіць, да на праўду выходзіць. Стары Ляксей усіх разумней. Што кажа стары на глум (для смеху) – бяры малады на вум. Усе нашы бацькі разумней нас былі. Стары з пуця не звядзець» [1,3].

Праз састарэлых бацькоў у сям'і ішла трансляцыя вопыту веры і духоўных перажыванняў, прыкладу ў ладзе жыцця, вытрымцы і цярпенні ў працы, перажыванні жыццёвых цяжкасцяў і ў падрыхтоўцы да смерці. Успомніце, ад каго вы навучыліся першай сваёй малітве, з кім у дзяцінстве хадзілі ў царкву да прычасця, чый ціхі сум перад Вялікаднем назіралі пастаянна (калі гэтага ўспомніць не можаце, то, мяркую па сваім вопыце, побач з вамі не было бабулі ці дзядулі)? Усё гэта я ўсвядоміла, дзякуючы сваім бабулям па простай прычыне: магла з імі часта бачыцца – бацькі выпрацавалі патрэбу ў сустрэчах з роднымі. Бабулі клаліся спаць адначасова з дзецьмі, а бацькі, звычайна, клаліся пазней, таму першы дзіцячы благагавейны «Ойча наш» перад сном быў сумесным з бабулямі. Што датычыцца цярпення людзей у веку і стаўлення іх да смерці, то аднойчы падчас фальклорнай экспедыцыі ад аднаго пажылога чалавека пачула: «Скаратай, Божа, лепей веку, толькі не дапусці дзяціную апеку» [1,3]. Прычым чалавек клапаціўся толькі пра дзяцей і думаў, каб ім не было цяжка яго, калі стане нямоглым, даглядаць. Я ведаю, і цяпер у вёсках нашага раёна старыя людзі у касцёлах па суботах моляцца за тое, каб Бог даў ім лёгкую смерць, а значыць, старасць самастойную, працаздольную, без фізічнай апекі дзяцей і ўнукаў. Збіранне старымі рэчаў «на смерць», «каб жа пахавалі не горш, як іншых», – гэта больш клопат пра дзяцей, аб змяншэнні турбот і каб людзі потым не пасмяяліся з родных.

Значная роля бабулі і дзядулю адводзілася ва ўзаемінах з унукамі. Звернемся да фальклорных запісаў з кнігі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Гродзенскае Панямонне»: «Маленькія былі, але

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ж калі дзядуля стары з намі, < … > кароўкі пасьцілі раніцай. Напасём, тады да скаціны яе пусцім тую кароўку. Тады ён усё хоць што расказываў … Расказываў, і гудзінкі мяне навучыў. Маленькая я была, у касьцёл мы ходзім раніцаю пяём да Маткі Боскай гудзінкі ў нядзелю. Так ён мяне навучыў, так я і цяпер помню…»[4,516]; «І дзедушка. Тата меў коні, каровы, так болей гаспадаркай глядзеў. І тое, што дзядуля скажэць – тое і свята. Ужо і не мама, ніхто яму не папраўлялі. І мы яго слухалі…»[4,516]; «Бабулька <глядзела> нас. Палезем на печ і сядзём да каторай пары. Бацькі малоцяць цапамі, а бабулька нам казкі расказваець, песьні спявае…» [4,517]. Гэтыя запісы пацвярджаюць тое, што бацькі амаль ўвесь час былі занятыя працай, з дзецьмі заставаліся бабулі і дзядулі, і вядомая традыцыйная беларуская «школа пешчання» была за імі. Безумоўна, бабулі і дзядулі шмат чаго маглі перадаць малым: казкі, мясцовыя бываліцы, легенды і паданні, прыказкі і прымаўкі, забаўлянкі і калыханкі, гушкалкі з прыгаворкамі ці бяскрыўднымі дражнілкамі. Напрыклад, асабіста я ведаю калыханкі, дзякуючы таму, што чула іх ад бабулі, калі тая калыхала майго меншага брата і дзяцей маёй цёткі (калі-нікалі і мне даводзілася іх «люляць» і тады я, як і бабуля, спрабавала спяваць).

Прыклады «школы пешчання» і ўзаемін старых з малымі можна знайсці і ў мастацкай літаратуры. Успомніце раман У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім»: на «дзядзькаванне» малога князя Алеся Загорскага, галоўнага героя рамана, аддалі ў сялянскую сям'ю, у якой мірна ўзаемадзейнічалі тры пакаленні (стары Даніла Кагут, яго сын з нявесткай, мноства іх дзяцей рознага ўзросту). Мы старога Кагута з «Каласоў пад сярпом тваім» бачым у баўленні часу з дзецьмі. У. Караткевіч паказвае нам, што гэты стары чалавек (а прататыпаў яго вобразу можна сустрэць у рэальным жыцці вельмі многа) аказаў моцны ўплыў на станаўленне характараў і светапогляду дзяцей.

Калі адысці ад літаратуры і мінуўшчыны і звярнуцца да сучаснаснай рэальнасці, то мне асабіста давялося чуць два зусім розныя меркаванні пра ўдзел пажылых у выхаванні дзяцей. Адно, выказанае маладой бабуляй бацькам шасцігадовага хлопчыка (мова арыгінала захоўваецца): «Ребёнку не нужно на такое длительное время [адзін тыдзень] ехаць в деревню. Там, в деревне, дети тупеют, он испугается стариков [прабабулю і прадзядулю]». І другое меркаванне дастаткова вядомага на Вілейшчыне чалавека Э. У. Мацюшонка, мастака, настаўніка Вілейскай гімназіі № 1 «Логас»: «Я шчаслівы чалавек, бо са мной побач ішоў мой дзед». Зрабіць высновы кожны павінен сам. Але трэба памятаць, што спрадвеку «да старых (дзядуль, бабуль) на Беларусі як дзеці, так і ўнукі звычайна адносіліся з павагай, пашанай, прыслухоўваліся да іх парад, заснаваных на вялікім жыццёвым вопыце» [3,20-21], «асновай станаўлення дзіцяці ў сям'і з'яўляюцца зносіны паміж сваякамі – бабуляй, дзедам, цёткамі, дзядзькамі, братамі, сёстрамі» [2,13]; і «пры іх дапамозе адбываецца духоўнае ўзбагачэнне членаў сям'і» [2,13]. У спрадвечнай традыцыі беларусаў былі цесныя сваяцкія ўзаеміны, і таму чалавек адчуваў, што ён у свеце не адзін. «Хочаш быць шчаслівым сам, дай шчасця тым, хто табе даравау жыццё», – такі закон народнай маралі, які акрэсліваў умовы ўзаемадзеяння ў сям'і са старымі. Людзі нават казкі, легенды стваралі пра маральную адказнасць дзяцей перад сваімі састарэлымі бацькамі («Трэба шкадаваць старых», «Як упярод хавалі», «Вось як даўней старых бацькоў кідалі» і іншыя).

Тэма выхавання павагі да старасці чырвонай стужкай праходзіць праз безліч фальклорных твораў, якія і да гэтага часу бытуюць на Вілейшчыне. Так у нас добра вядома паданне, як гаспадар з жонкаю былі не задаволены старым бацькам і не хацелі, каб ён еў з імі за адным сталом, бо той разліваў пахлёбку, а з барады яго сыпаліся крошкі. Муж з жонкаю часта абмяркоўвалі гэта пры сваіх дзецях і, нарэшце, аддзялілі дзеда, сталі падаваць яму ежу ў запечку. Аднойчы іх малы сынок нешта майстраваў. Бацька запытаў яго, што ён робіць. Сынок адказаў, што майструе карытца. «А навошта ж яно табе?» – спытаў бацька. «А гэта, татка, калі вы з мамкаю станеце старэнькімі, як наш дзед, то будзеце есці з гэтага карытца на прыпечку, каб за сталом чыста было», – адказаў малы. З таго ж дня дед абедаў зноў за агульным сталом і ніколі больш не было размоў аб тым, які ён стары і неахайны. У народзе заўсёды казалі: «Як ты даглядаеш сваіх старых, так і цябе дагледзяць твае дзеці. Хто старых шануе, той сабе добрую старасць гатуе. Хто на старога бацьку руку падніме, той у сваіх дзяцей пад нагамі пабудзе» [1,7].

У наш час, мне падаецца, нават у межах маёй сям'і, дзе традыцыі сваяцтва і ўзаемадзеяння з пажылымі былі моцнымі, адбываецца аддаленне сваякоў адзін да аднаго, скасоўваюцца брацкія адносіны. Можна сказаць, што і раней не ва ўсіх сем'ях было ўсё гладка ў гэтым плане. Народныя фальклорныя творы пра гэта сведчаць. Возьмем хаця б прыказкі пра зяця і цешчу, нявестку і свякроў, пра ўзаеміны паміж дзецьмі і бацькамі: «Ехаў да цешчы, дык ад радасці плакаў, а назад вяртаўся, дык ад гора спяваў. Як зяць паганы – запражэ цешчу ў сані. Прымак цешчынага ката на «вы» завець. У добрай свякроўкі і нявестка хвалёная. Дзе тыя добрыя дочкі дзяюцца, адкуль нявесткі няўмелыя бяруцца? Ад добрай дочкі не бегае маці ўпрочкі. Ад добрай маткі не збягаюць з хаткі. Адзін бацька пяць сыноў гадуе, а пяці сынам і аднаго бацьку дагледзець цяжка» [1,9].

Школа ў наш час часта бярэ на сябе функцыі сямейнага выхавання і займае шмат вольнага часу дзяцей. Просты прыклад з уласнага жыцця: у дзяцінстве, я памятаю, спяшалася дамоў у суботу пасля ўрокаў, каб дапамагчы бацькам прыбраць кватэру або каб хутчэй паехаць з імі ў вёску да бабулі і дзядулі, а мой сын у суботу бяжыць у школу. Цяпер і ўрокаў няма па суботах, але дзеці ў школе, а не дома з бацькамі. Сучаснай выхаваўчай сістэме не хапае разумення, што не ўстановы адукацыі, а, менавіта, сям'я – галоўны інстытут выхавання. І чым яна (сям'я) большая, чым больш у ёй дзяцей, чым больш пакаленняў жывуць у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

згодзе
і паразуменні, тым лепшыя ўмовы для выхавання і развіцця дзяцей.

**Спіс літаратуры:**


1. Асабісты архіў Матусевіч Т.П. / Матэрыялы запісаныя ў вёсках Вілейскага і Валожынскага раёнаў.
2. Грымаць, А.А. Народная педагогіка беларусаў : метад дап. / А.А. Грымаць, Л.М. Варанецкая, У.В. Пашкевіч. – Мінск : Выд. У.М. Скакун. – 1999. – 243 с.
3. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л.В. Ракава. – Мінск :Ураджай, 2000. – 256 с.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне : у 2 кн. Кн. 2 / А.М. Боганева [і інш.] ; рэд. Т.Б. Варфаламеева. – Мінск : Выш. школа, 2006. – 467 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ